# Аляксей і Надзея Палуніны
# – партызаны брыгады Пруднікава



Аляксей Васільевіч Палунін – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля яе заканчэння жыў і працаваў на Астравеччыне і сваёй працай унёс уклад у яе развіццё. Аляксей і Надзея Палуніны на Астравеччыну прыехалі пасля вайны ў 1947 годзе.

Аляксей Васільевіч і яго жонка Надзея Аляксандраўна падчас вайны былі ў партызанскім атрадзе. Жыццё ў лесе і ночы ў зямлянках не дадалі ім здароўя – вельмі хутка высветлілася, што ў Надзеі Аляксандраўны туберкулёз. І Палунін адправіў яе ў самы лепшы на той час санаторый «Лаванда» ў Крым. Там яна лячылася, там жа і памерла. Аляксей Васільевіч на таксі прывёз нябожчыцу сюды і тут пахаваў. Вось такое было вялікае каханне.

Што ж датычыцца самога Аляксея Васільевіча, то ўсё сваё жыццё на Астравеччыне ён прысвяціў смалакурнаму заводу.

Райхімлясгас знаходзіўся на месцы сённяшняга раённага аддзела па

надзвычайных сітуацыях – тут выраблялі дзёгаць, паташ, смалу, шкіпінар і іншую прадукцыю, якую, дарэчы, прадавалі нават за межы Беларусі.

*З успамінаў Валерыя Сяргеевіча Блахіна*
*пра сябра яго бацькі А.В Палуяна:*

– Помню, як пад Катлоўкай нарыхтоўвалі карчы і праз лес напраскі прывозілі ў Астравец. Тут перараблялі і атрымлівалі добра прадаваемую на той час прадукцыю, – гаворыць Валерый Сяргеевіч.
Дарэчы, у адным з нумароў «раёнкі» за 1947 год мне пашчасціла знайсці артыкул «У чэсць вялікага свята», надрукаваны пад рубрыкай «Нашы падарункі слаўнай гадавіне». Яго аўтар – начальнік райхімлясгаса Аляксей Палунін расказвае пра калектыў рабочых смалакурнага завода «Альгіняны», якія, сустракаючы трэцюю гадавіну вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, перавыканалі чэрвеньскае заданне па выпрацоўцы шкіпінару.

У Палуніных быў сын. Па словах Валерыя Сяргеевіча, Палунін – малодшы пасля заканчэння Гродзенскага медінстытута працаваў па размеркаванні ў Віцебску.

– Аляксей Васільевіч памёр у 1964 годзе. Я быў на пахаванні. Асабліва запомнілася, што прыехала вялікая дэлегацыя ваеннаслужачых, якія некалі разам з ім ваявалі. Сярод іх былі падпалкоўнікі і палкоўнікі, а на іх форме – ордэны і медалі, – узгадвае Валерый Сяргеевіч.

Мужчына прыгадаў і яшчэ адзін выпадак. Дзесьці ў 1962 годзе яму падчас службы ў арміі давялося наведаць музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. На адным са стэндаў малады чалавек убачыў на фотаздымку знаёмы твар.

– Гэта быў сябар майго бацькі – Аляксей Васільевіч Палунін. Побач было яшчэ некалькі здымкаў. На адным з іх – яго жонка Надзея Аляксандраўна, – расказвае Валерый Сяргеевіч. – Фотаздымкі былі падпісаны.

З іх даведаўся, што разам са сваёй групай Аляксей Васільевіч партызаніў у Віцебскай вобласці, прыкрываў накірунні Віцебск – Мінск, Віцебск – Вільнюс. Ён падарваў 14 эшалонаў – за гэта атрымаў ордэн Леніна і некалькі медалёў.

Тое, што ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны сапраўды ёсць інфармацыя пра Аляксея Васільевіча Палуніна, пацвердзіла пісьмо дырэктара музея:
«У фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца фотаздымак Аляксея Васільевіча Палуніна, які паступіў у музей у 1957 годзе з экспедыцыі супрацоўнікаў музея ў былую Маладзечненскую

вобласць, з наступным запісам: «Аляксей Васільевіч Палунін – камандзір дыверсіённай групы партызанскай брыгады Пруднікава Віцебскай вобласці». Іншая інфармацыя пра ветэрана, на жаль, у музеі адсутнічае».

Дарэчы, на сайце «Памяць народа» (https://pamyat-naroda.ru) пры пазначэнні прозвішча Палунін можна знайсці ажно тры архіўныя запісы. Першы сведчыць, што Аляксей Васільевіч прапаў без звестак. У яшчэ двух – указаны розныя месцы нараджэння Аляксея Васільевіча, затое і ў адным, і ў другім дакументах пазначана, што Палунін узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны другой ступені.

Цікавым падаўся і яшчэ адзін факт. На сайце «Жди меня» з 2010 года Аляксея Васільевіча Палуніна шукае яго ўнучка. Але той гэта Палунін, пра якога расказаў Валерый Блахін, ці іншы чалавек, высветліць пакуль не ўдалося.

У тэксце пісьма на сайце «Жди меня» ўпамінаецца і Астравецкі раён.

«Дедушка был награждён орденом Ленина и медалью «Партизану Отечественной войны» 1 степени. У нас даже есть письмо от 19.12.89 5д-89 от и.о. пом. прокурора Островецкого района в Белоруссии В.А. Железинского, в котором сказано, что дедушка действительно был награждён».

…Партызаны Надзея Аляксандраўна і Аляксей Васільевіч Палуніны пахаваны ў Астраўцы. Іх магілы, на якіх стаяць помнікі з чырвонымі зорачкамі, даглядае Валерый Блахін.

– Мае бацькі пахаваны побач. Таму, калі прыходжу да іх, заглядваю і да Палуніных, – гаворыць мужчына. – Вельмі спадзяюся, што гэтых людзей яшчэ помняць на Астравеччыне і змогуць расказаць пра іх крыху больш.

Текст:
Фото: Елена Ярошевич